1. *Рудницкий, К. Л.* Театральные сюжеты / К. Л. Рудницкий. – М. : Искусство, 1990. – 464 с.

2. *Казько, В.* На грани легенды и реальности / В. Казько // Литер. газета. – 1984. – 25 янв. – С. 16.

3. *Лихачев, Д. С.* Нить, связующая поколения / Д. С. Лихачев // Литер. газета. – 1985. 13 февр. – С. 16.

## ВЫПРАБАВАННЕ НА МУЖНАСЦЬ: ТВОРЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ КУПАЛАЎЦАЎ У ЧАС ВАЙНЫ (да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і да 100-годдзя Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы)

***Р. Б. Смольскі,***
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар,*
*галоўны навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела*
*ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020 год асаблівы для нашай дзяржавы, для беларускай нацыянальнай культуры. Мы толькі што адсвяткавалі 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, а неўзабаве адзначым яшчэ адну выдатную і даволі рэдкую падзею. 14 верасня 2020 г. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы адсвяткуе свой стогадовы юбілей. Гэта сапраўдная з'ява ў культурным жыцці нашай краіны, якая сведчыць пра творчую сталасць беларускага нацыянальнага сцэнічнага мастацтва.

У гэтай сувязі варта ўзгадаць і прааналізаваць некаторыя старонкі дзейнасці славутага калектыва менавіта ў час мінулай вайны.

Першы Беларускі драматычны тэатр (БДТ-1) у чэрвені 1941 г. у поўным складзе выехаў на летнія гастролі ў Адэсу. Гэта быў ужо не першы выезд творчага калектыву ў гэты паўднёвы горад. Адэскія аматары сцэнічнага мастацтва добра ведалі беларускіх акцёраў, высока цанілі іх майстэрства. Тэатральная зала заўсёды была перапоўнена ўдзячнай публікай.

У нядзелю раніцай 22 чэрвеня ігралі спектакль «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы для ваенных маракоў. Спектакль распачаўся ў 12 гадзін. Прымалі сатырычную камедыю вельмі добра, у глядзельнай зале панавала цёплая і ўзрушаная атмасфера. Акцёры працавалі з асаблівым імпэтам і тэмпераментам. Але раптам прыйшло паведамленне пра пачатак вайны, і спектакль перапынілі. А ўжо вечарам ігралі патрыятычны спектакль «Партызаны» К. Крапівы, што цалкам адпавядала ваеннаму часу.

Праз некалькі дзён калектыў БДТ-1 быў ужо ў Маскве, адтуль тэатр накіравалі ў Томск. Там беларускаму калектыву прадставілі памяшканне мясцовага тэатра, аказалі дапамогу з дэкарацыямі і касцюмамі. Паўстала пытанне, на якой мове іграць спектаклі. Пытанне складанае, доўга абмяркоўвалі ў калектыве, раіліся з мясцовамі ўладамі. Паступова прыйшлі да агульнага рашэння – спектаклі іграць на рускай мове, каб томскія гледачы лепш разумелі змест сцэнічных твораў у выкананні беларускіх акцёраў. І толькі два спектаклі «Партызаны» К. Крапівы і «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка выконваліся на беларускай мове, бо ў іх найбольш дакладна і выразна адчуваўся народны каларыт, нацыянальная асаблівасць у мове, адметнасць сцэнічных характараў.

Рэжысёрам і акцёрам давялося як бы зноўку ствараць спектаклі, бо мянялася моўная рытміка, манера вымаўлення, прыйшлося прывучацца ў іншай танальнасці весці дыялогі. Зразумела, што ў першыя часы нярэдка ў рускім тэксце гучалі беларускія трапныя словы і пэўныя нацыянальныя інтанацыі.

Мясцовыя ўлады стварылі неабходныя ўмовы ў адпаведнасці з магчымасцямі ваеннага часу, размеркавалі артыстаў па кватэрах. Неўзабаве ў Томск таксама прыехаў Е. Міровіч, які адразу ўключыўся ў творчы працэс.

1 верасня 1941 г. БДТ-1 адкрыў свой першы ваенны сезон спектаклем «Партызаны». Глядзельная зала была перапоўнена. Кантакт паміж акцёрамі і гледачамі быў устаноўлены адразу. Томскія гледачы адчулі еднасць пачуццяў і памкненняў з беларускімі майстрамі сцэны.

Зусім натуральна, што спектаклі БДТ-1 ішлі ў прынцыпова новай атмасферы, кардынальна змяніўся звыклы рытм жыцця. Спачатку ігралі даваенныя спектаклі, адначасова пачалі рэпеціраваць новыя пастаноўкі. Мастацкі кіраўнік трупы Л. Рахленка разам са сваімі паплечнікамі напружана працаваў над аднаўленнем бягучага рэпертуару. На афішы з’явіліся спектаклі «Скупы» Мальера, «Фландрыя» В. Сарду, «Машачка» А. Афінагенава, «Апошнія» М. Горкага, «Неспакойная старасць» Л. Рахманава, «Платон Крэчат» А. Карнейчука і інш. Іх з непрыхаванай цікавасцю глядзелі томскія гледачы.

Калектыў добра разумеў, што ў надзвычайных умовах ваеннага часу ад тэатральных творцаў чакаюць адпаведных пастановак патрыятычнага гучання. Першая прэм’ера ў Томску адбылася 12 верасня 1941 г. паводле папулярнай у той час п’есы К. Сіманава «Хлопец з нашага горада» ў рэжысуры К. Саннікава і сцэнаграфіі І. Ушакова. Работу над гэтым спектаклем тэатр пачынаў яшчэ вясной у Мінску, а выпускаць прэм’еру ўжо давялося ў далёкім сібірскім горадзе ў жорсткіх акалічнасцях ваеннага часу. У галоўнай ролі Сяргея Луконіна ўдала выступіў пачынаючы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

акцёр Б. Кудраўцаў, які адразу стаў любімцам мясцовай публікі, асабліва моладзі.

Неўзабаве сталі з'яўляцца першыя п'есы савецкіх драматургаў, прысвечаныя непасрэдным падзеям вайны. Некаторыя з іх – «Крылатае племя» А. Первенцава і «Душа Масквы» Л. Нікуліна ў 1942 г. убачылі святло рампы БДТ-1 у Томску. Але лепшыя пастаноўкі былі наперадзе.

Прэм'ера спектакля «Фронт» А. Карнейчука адбылася 5 лістапада 1942 г., яе вельмі горача прынялі мясцовыя гледачы. Галоўнае, што вылучала рэжысёрскую работу Л. Рахленкі, гэта дакладнае разуменне дзеля чаго ён стварае сцэнічны твор у канкрэтных абставінах ваеннага часу. Спектакль быў выбудаваны з дакладным адчуваннем яго ўнутранай логікі, з выяўленнем дынамікі змагаючыхся сіл, з натуральнай зменай эмацыянальных эпізодаў, з цвёрда вызначанай рытмічнай партытурай.

У галоўнай ролі камандуючага фронтам генерала Івана Горлава выступіў У. Уладамірскі – прызнаны майстар вытанчанай сцэнічнай формы. Яго герой быў безнадзейна адсталым ад патрабаванняў часу камандзірам. У багатай акцёрскай палітры пераважалі адкрыта сатырычныя фарбы і адценні.

Ролю маладога і таленавітага генерала Агнёва выконваў Б. Платонаў, які ўжо сфарміраваўся ў магутную і непаўторную творчую індывідуальнасць. Яго адметны і выразны акцёрскі тэмперамент, памножаны на дакладную псіхалагічную распрацаванасць, паглыбляў і ўзбуйняў сцэнічны характар героя. Вобраз вызначаўся ўнутранай дынамікай, быў пазбаўлены штучнай дэкларатыўнасці і хадульнасці. Б. Платонаў бліскуча здолеў перадаць у вобразе генерала Агнёва галоўнае – магутную моц яго яркага ваеннага таленту.

Натхнёны даволі заўважным вынікам сваёй працы над спектаклем «Фронт», Л. Рахленка адразу бярэцца за новую пастаноўку паводле п'есы К. Сіманава «Рускія людзі». Сцэнічнае ўвасабленне гэтай драмы калектывам БДТ-1 (прэм'ера адбылася 24 красавіка 1943 г.) увайшло ў гісторыю айчыннага тэатра як прыклад выразнай і актуальнай пастаноўкі на тэму Вялікай Айчыннай вайны.

У пачатку 1943 г. у БДТ-1 была створана франтавая брыгада ў складзе 12 чалавек. Быў складзены план работы па падрыхтоўцы адпаведнага рэпертуару. Вырашылі, што асновай выступленняў франтавой брыгады будуць найбольш яркія эпізоды са спектакляў, а таксама канцэртныя нумары – вершы, байкі, песні, танцы.

У красавіку 1943 г. творчая брыгада выехала выступаць перад франтавікамі. У праграме былі асобныя сцэны са спектакля «Скупы» Мальера, музычны квартэт і жаночы квінтэт беларускай народнай песні – В. Пола, Р. Кашэльнікава, З. Лідская, Я. Зайчык, М. Шашалевіч. Акцёр Б. Янпольскі акампаніраваў квінтэту на баяне, а З. Стома – на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канцэрціна. Кожнае выступленне беларускіх акцёраў прымалася байцамі і афіцэрамі Чырвонай Арміі вельмі горача і ўдзячна.

У ліпені 1943 г. адбылася змена мастацкага кіраўніка БДТ-1. Замест Л. Рахленкі на гэту адказную пасаду быў прызначаны вядучы майстар нацыянальнай сцэны Г. Глебаў. Л. Рахленка застаўся акцёрам і рэжысёрам трупы.

У канцы 1943 г. пачалося вызваленне гарадоў і вёсак Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Так, першымі былі вызвалены Крычаўскі, Быхаўскі і Слаўгарадскі раёны, у якіх паступова стала аднаўляцца мірнае жыццё. Калектыў БДТ-1 адразу пачаў, натуральна, рыхтавацца да вяртання ў родны Мінск. Зразумела, што паўстала пытанне аб неабходнасці пашырэння і ўзбагачэння рэпертуарных даляглядаў. Зноў звярнуліся да багатай драматургічнай спадчыны Янкі Купалы і 23 мая 1944 г. запрасілі томскіх гледачоў на чарговую прэм'еру – спектакль «Вечар камедый» паводле п'ес класіка беларускай літаратуры «Паўлінка» і «Прымакі». Рэжысёрам гэтай пастаноўкі стаў Л. Літвінаў.

Пасля першых трох паказаў было вырашана адмовіцца ад другой часткі пастаноўкі «Прымакі» і аставіць толькі «Паўлінку», якая з цягам часу стала сапраўднай і ўнікальнай сцэнічнай легендай і візітоўкай вядучага беларускага тэатра.

Пра гэты спектакль шмат напісана грунтоўных кніг, разнастайных артыкулаў і рэцэнзій, успамінаў і ўсё гэта ўтварыла сапраўдны тэатральны феномен у гісторыі нацыянальнага сцэнічнага мастацтва. Але самае галоўнае, што з таго часу «Паўлінка» Я. Купалы ў рэжысуры Л. Літвінава і сцэнагрфіі Б. Малкіна ўжо ніколі не сыходзіла са сцэны славутага тэатра, толькі мяняліся пакаленні выканаўцаў – маладыя акцёры замянялі сваіх слынных папярэднікаў і працягвалі лепшыя і плённыя традыцыі беларускага тэатра.

Першымі і надзвычай бліскучымі выканаўцамі роляў у спектаклі «Паўлінка» былі Р. Кашэльнікава (Паўлінка) і І. Шаціла (Якім Сарока), а таксама У. Дзядзюшка (Крыніцкі), Г. Глебаў (Пустарэвіч), Л. Ржэцкая (Альжбета), В. Пола (Агата), Б. Платонаў (Адольф Быкоўскі).

Адначасова ў рэпертуары тэатра з'яўляюцца яшчэ некалькі новых пастановак, у прыватнасці «Позняе каханне» А. Астроўскага і «Сабака на сене» Лопэ дэ Вегі ў рэжысуры Л. Літвінава, якія з вялікай цікавасцю прымалі томскія гледачы.

Летам 1944 г. калектыў выехаў у Юргу, дзе знаходзіўся летні ваенны лагер Томскага артылерыйскага вучылішча. Штовечар ігралі спектаклі, выступалі з канцэртамі, выязджалі для абслугоўвання навакольных калгасаў, саўгасаў, гарадскіх пасёлкаў, прадпрыемстваў. Удзячная глядзельная зала адказвала сваімі гарачымі пачуццямі, доўгімі апляды-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сментамі. Гэта кампенсавала беларускім акцёрам цяжкасці і складанасці жыцця ў ваенны час.

Вечарам 3 ліпеня 1944 г. у далёкую сібірскую Юргу даляцела доўгачаканая радасная вестка аб вызваленні Мінска. Ваеннае камандаванне мясцовага гарнізона наладзіла з гэтай нагоды ўрачысты вечар, беларускіх тэатральных дзеячаў шчыра віншавалі і адначасова дзякавалі за выдатныя спектаклі і канцэрты.

Пасля заканчэння гастроляў БДТ-1 вярнуўся на сваю базу ў Томск. Калектыў пачаў рыхтавацца да вяртання на Радзіму. Але адначасова і працягвалася напружаная творчая праца над новымі спектаклямі. Л. Рахленка пачаў распрацоўваць рэжысёрскую эксплікацыю паводле новай п’есы пачынаючага беларускага драматурга Алеся Кучара «Заложнікі», прысвечанай славутаму партызанскаму камандзіру бацьку Мінаю. Прэм’ера спектакля адбудзецца ўжо ў Мінску ў 1945 г. Але гэта здарыцца потым, а пакуль увесь калектыў тэатра лічыў кожную гадзіну, кожную хвіліну да таго шчаслівага моманту, калі можна будзе рушыць у дарогу на радзіму.

І гэты момант прыйшоў. Момант, аб якім мроілася ўсе гэтыя такія цяжкія, пакутлівыя гады ў далёкім сібірскім краі. Радасць была адначасова афарбавана пэўным і натуральным сумам развітання. Удзячнасць за шчодрую гасціннасць і людскую цеплыню перапаўняла сэрцы беларускіх акцёраў і іх сямейнікаў. Гэта бралася з сабой у дарогу.

Ці мог хто-небудзь уявіць, што радасць вяртання будзе азмрочана нечаканым трагічным здарэннем. Недалёка ад Омска вечарам 23 верасня 1944 г. чатыры апошнія вагоны, у якіх ехаў калектыў БДТ-1, паляцелі пад адхон. Чаму, па якой прычыне здарылася гэта жудасная чыгуначная катастрофа, – так і засталося невысветленым да сённяшняга часу.

Сярод загінуўшых – выдатныя акцёры Канстанцін Быліч, Барыс Аляксеенка, Маргарыта Шашалевіч, Іван Счансновіч, дачка Г. Глебава Гелена. Давялося вярнуцца ў Омск. Пахавалі загінуўшых, аддаўшы апошні паклон. Зноў рушылі ў дарогу. На некалькі дзён спыніліся ў Маскве. Кіраўніцтва тэатра вырашала шматлікія арганізацыйныя пытанні, а акцёры хадзілі па сталічных вуліцах, углядваліся ў твары людзей.

Потым зноў на вакзал у цягнік і паехалі ў родную і шматпакутную Беларусь, у родны Мінск.

Тут вельмі парадавала і абнадзеіла тое, што будынак тэатра захаваўся ў добрым стане, можна было адразу брацца за работу.

Адкрыліся спектаклем рэжысёра Е. Міровіча паводле п’есы В. Галаўчынера «Урок жыцця». У глядзельнай зале з гэтай выключнай нагоды знаходзіліся прадстаўнікі вышэйшых партыйных і дзяржаўных органаў рэспублікі, шматлікія ваенныя, былыя партызаны, мірнае насель-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніцтва. Атмасфера была вельмі ўрачыстая і прыўзнятая. Спектакль быў надзвычайна горача прыняты.

У кастрычніку і лістападзе ігралі ўвесь наяўны рэпертуар, што быў назапашаны ў часы эвакуацыі ў Томску, а таксама некаторыя спектаклі яшчэ даваеннай пары. Глядзельная зала была заўсёды перапоўненай, і гэта яскрава сведчыла аб вялікай запатрабаванасці сцэнічнага мастацтва. Адначасова гэта паказвала і высокі мастацкі ўзровень і сталасць творчага калектыву БДТ-1.

21 снежня 1944 г. урад БССР прыняў пастанову аб наданні тэатру імя народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Менавіта з гэтага часу тэатр стаў называцца *Беларускім дзяржаўным тэатрам імя Янкі Купалы*.

Творчая дзейнасць купалаўцаў у час мінулай вайны засведчыла высокі творчы і маральны ўзровень акцёраў, рэжысёраў, мастакоў і ўсіх іншых супрацоўнікаў тэатра, іх дакладнае грамадзянскае ўсведамленне сваёй адказнасці перад мастацтвам і сваёй роднай Бацькаўшчынай. Выпрабаванне на мужнасць першы беларускі драматычны тэатр прайшоў дастойна.

## ЭСТЕТИКА ГЕРОИЧЕСКОГО. О БЕЛОРУССКОЙ МУЗЫКЕ НА ТЕМУ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

***В. Л. Яконюк,***
*доктор педагогических наук, профессор,*
*заведующий кафедрой музыкальной педагогики, истории*
*и теории исполнительского искусства учреждения образования*
*«Белорусская государственная академия музыки»*

Многовековая история Беларуси – это борьба за свою независимость, государственный суверенитет, самобытность культуры и языка, своеобразие национального искусства. Эта историческая борьба очень часто приобретала весьма драматический характер.

Великая Отечественная война, 75-летие окончания которой мы сейчас отмечаем, принесла неисчислимые бедствия белорусскому народу. В этой войне погиб каждый четвертый (по некоторым данным каждый третий) белорус. И только сейчас, спустя семьдесят пять лет число жителей Беларуси достигло довоенного уровня. Современная столица независимой Беларуси красавец-Минск – это гордость нового поколения белорусов. Однако после его освобождения в 1944 г. он представлял собой груду развалин, среди которых сохранилось лишь несколько крупных зданий и в том числе (историческая справедливость!) Национальный оперный театр. Поэтому уже в конце 1944 г. в освобожденном

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ